

Газета заснавана ў 1938 годзе. Аднаўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№37 (327) 18 — 24 верасня 2003 г. Наклад 11.500 экз. Кошт 400 руб.

«ГАЗЕТУ СЛОНІМСКУЮ» ЧЫТАЮЦЬ Слонім, Зэльва, Дзятлава, Масты, Ваўкавыск, Шчучын, Ліда, Гродна, Баранавічы, іншыя гарады Беларусі, а таксама на HTTP://gs.promedia.by

АНОНС

КУРСЫ ОБМЕНА ВАЛЮТ ПО СОСТОЯНИЮ НА 16.09.2003 ГОДА

"Беларусбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2090	2125
1 EURO	2270	2390
1 ZL	505	535
1 RUS	66	69

ОАО "Белпромстройбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2095	2118
1 EURO	2275	2370
1 ZL	510	545
1 RUS	67	69,4

"Белагропромбанк"	Покупка	Продажа
1 USD	2095	2125
1 EURO	2280	2380
1 ZL	490	550
1 UAH	360	400
1 RUS	66	69

Нацбанк РБ	
1 USD	2100
1 EURO	2369,43
1 RUS	68,4

ВЁСКА

КАПАННЕ БУЛЬБЫ Ў САМЫМ РАЗГАРЫ




Фота Таццяны ПЛАХЕТКА

"Пакуль збярэш на сотках бульбу – сто разоў сагнешся ў кульбу," – жартуюць вяскоўцы. І кожную восень на бульбяныя палі выходзяць тысячы беларусаў, каб у пару сабраць "другі хлеб". На Слонімшчыне сёлета бульба ўрадзіла. І зямля такім чынам аддзячыла земляробам за шматлікія паклоны ёй падчас капання.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

НА КПЗ НЕ ХАПАЕ МАКУЛАТУРЫ, А НА МЯСАКАМБІНАЦЕ – МЯСА


Фота з архіва "ГС"

■ Машыны на КПЗ круцяцца, пакуль ёсць сыравіна

Несуцяшальнымі, па падліках спецыялістаў, сталі вынікі працы за 8 месяцаў бягучага года шэрага прамысловых прадпрыемстваў раёна.

У цэлым, мяркуецца, прагнозныя паказчыкі тэмпаў росту вытворчасці ў 2003 годзе на Слонімшчыне не дасягнуць 100%.

На пачатку верасня на кардонна-папяровым заводзе былі вымушаны спыніць працу дзвюх (з чатырох наяўных) машын. Прычына – недахоп макулатуры. Сыравіна паступае ў вытворчасць, літаральна, з калёс, і толькі пры яе дастатковай колькасці завод можа працаваць на поўную магутнасць.

У Беларусі сваёй макулатуры не хапае, а купляць за мяжой – дорага.

Да таго ж, па словах намесніка генеральнага дырэктара прадпрыемства Раісы Хмарык, за адгружаную гатовую прадукцыю не спяшаюцца разлічвацца заказчыкі, і завод, у сваю чаргу, застаецца вінаватым энергетыкам. Ды і са сваімі працаўнікамі па заробку за ліпень разлічыліся толькі ў верасні.

На мясакамбінаце з-за недахопу сыравіны прыпынялі працу ў забойным і мяса-тлушчавым цэхах. Апошнім часам, як сказаў дырэктар прадпрыемства Вячаслаў Нарута, мясакамбінат загружаны толькі на 50% ад вытворчых магутнасцей. Аднак, на думку дырэктара, гэта не значыць, што тых жа бычкоў у гаспадарках раёна стала менш – іх проста прытрымліваюць у чаканні павышэння закупачных цэн. Цяпер мясакамбінат плаціць пастаўшчыкам ад 1410 да 596 рублёў (у залежнасці ад укормленасці) за кілаграм жывой вагі буйной рагатай жывёлы і ад 2390 рублёў і ніжэй – за кілаграм свініны. У параўнанні з рыначным коштам "жывой" ялавічыны ці свініны, гэта зусім не многа. Тэрмін разлікаў – да 10 банкаўскіх дзён з гаспадаркамі і ў той жа дзень з насельніцтвам. Аднак ніхто асабліва не спяшаецца сёння здаваць сваю жывёлу на мясакамбінат.

Выгадней мець справу з прыватнікамі. Гэта пры тым, што сама прадукцыя Слонімскага мясакамбіната каштуе вельмі дорага. Купіць мясныя прадукты і каўбасу на рынку абыдзецца значна танней.

Аднак спад вытворчасці назіраецца не на ўсіх слонімскіх прадпрыемствах. Так, дырэктар мясцовага вінзавода Міхаіл Акулік назваў лічбу росту вытворчасці на сваім прадпрыемстве за 8 мінулых месяцаў у 114,3%. Самога Міхаіла Васільевіча Беларускі дзяржаўны канцэрн харчовай прамысловасці нядаўна ўзнагародзіў Ганаровай граматай за развіццё нацыянальнага пладова-ягаднага вінаробства.

А ўжо ў лістападзе, па словах дырэктара, у гандаль паступяць тры новыя гатункі віна вытворчасці Слонімскага вінзавода.

Мікола КАНАНОВІЧ

СОЦИУМ

ИМ ВЕЗДЕ У НАС ДОРОГА...

Во многих школах, предприятиях нашего города полным ходом идет агитация молодежи от 14 до 31 года на вступление в общественное объединение "Белорусский Республиканский Союз Молодежи" (БРСМ).

Самым привлекательным моментом для будущих членов БРСМ является система скидок на многие виды услуг, которые предоставляют некоторые слонимские предприниматели.

Так, например, если вы всетаки решили вступить в БРСМ, заплатив за членский билет 700 рублей и столько же за значок, то у вас появляется возможность со скидкой покупать бытовую технику в магазинах индивидуального предпринимателя Сергея Данько, стричься в парикмахерских индивидуального предпринимателя Юрия Адамчука, делать фотографии в "Графъ-фото" (ИП Владимир Янушевич), покупать билеты на дискотеку "Оскар", пользоваться услугами свадебного салона "Невеста"...

А на республиканском уровне члены БРСМ имеют скидки на проживание в отелях, посещение музеев, кинотеатров и т.п.

"Есть даже специальная брошюра со всеми скидками для членов нашего объединения, – рассказывает главный специалист городского комитета общественного объединения БРСМ Ирина Герасик. – Льгот для членов БРСМ очень много. В некоторых магазинах Беларуси даже предусмотрены скидки на покупку колбасных изделий".

Молодежь легко привлечь всевозможными льготами. И особенно, если подкрепить агитацию в ряды БРСМ высокопарными словами о "светлом будущем" членов этого общественного объединения.

Ирина Л. 15-ти лет поделилась своими впечатлениями после проведенной в их школе агитации: "Учительница сказала, что, несмотря на наше желание вступать или нет в ряды БРСМ, все равно она нас ТУДА запишет. Это якобы дает преимущества при поступлении в высшие учебные заведения. А я все равно членские взносы не буду платить!".



Фота Валерыя КАВАЛЕНКІ

■ Комсомол, БПСМ, БРСМ...

Так и пополняются ряды БРСМовцев. Кого-то привлекают льготы, а кто-то, чтобы отвязаться от своего начальства, которое настойчиво рекомендует быть членом этого объединения, приобретает членский билет этого объединения.

Во многих европейских странах достаточно просто быть молодым, чтобы получать всевозможные скидки и пользоваться льготами. И не надо никому показывать членский билет какой-нибудь общественной организации.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

ШУКАЮЦЬ ВІНАВАТЫХ Ў ПАЖАРЫ

Днямі ў дачыненні да некаторых адказных асоб была ўзбуджана крымінальная справа па факту пажару ў вялікай зале раённага дома культуры.

Нагадаем, што пажар здарыўся 8 жніўня. У выніку, агнём была знішчана маемасць на пэўную суму. Аднак следства, па словах начальніка следчага аддзела міліцыі Івана Шыркаўца, пакуль не можа назваць канкрэтныя прозвішчы вінаватых, якія праходзяць па справе.

У БУДАЎНІКОЎ УКРАЛІ ЛІНОЛЕУМ

На будаўнічым аб'екце ў вёсцы Сасноўка, які абслугоўвала "Слонімская МПМК -163", укралі лінолеум на суму 78 тысяч рублёў.

Кіраўніцтва гэтай будаўнічай арганізацыі паведаміла пра крадзеж у міліцыю. Па факту крадзяжу праводзіцца праверка.

РАЗГАРАДЗІЛІ

На мінулым тыдні з плота на Садовай вуліцы ў сланімчанкі С. знялі алюмініевую сетку.

Жанчына не пажадала міryцца са знікненнем агароджы на сваім участку і заявіла ў міліцыю.

Праводзіцца праверка.

ЗНЁС КАСАВЫ АПАРАТ

Лічаныя хвіліны спатрэбіліся мужчыне, каб украсці з вынаснай гандлёвай кропкі каля "Сталовай №1" на вуліцы Першамайскай касавы апарат.

У такіх апаратах выручка не ўтрымліваецца, але сам ён каштуе каля 400 тысяч рублёў.

Па гарачых слядах работнікі міліцыі выйшлі на злодзея. Ім аказаўся жыхар вёскі Талькаўшчына, які толькі месяц як вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі.

Касавы апарат міліцыянеры вярнулі гаспадарам. А раней судзімаму С. прыйдзецца адказаць па законе і за гэтае злачынства.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЧЕТЫРЕ ПОЖАРА ЗА НЕДЕЛЮ

За прошедшую неделю сотрудники Слонимской пожарно-аварийной спасательной части №1 зарегистрировали четыре пожара.

Один из них произошел в деревне Мелькановичи, где возле одного из сараев сельчанина загорелась солома в тюках. Огонь уничтожил 100 кг соломы.

В понедельник, 14 сентября, сотрудники ПАСЧ-1 выезжали на ул. Красноармейскую тушить жилой дом. Огонь повредил перекрытия постройки.

Ольга ШИНКЕВИЧ

СОЦЫУМ

СТАРАСЦЬ НЕ РАДАСЦЬ...

Сёння колькасць жыхароў Беларусі ва ўзросце 60 гадоў і больш складае больш за два мільёны чалавек, прычым кожны чацвёрты з іх перайшоў 75-гадовы рубеж.

З іх 125 тысяч пенсіянераў — гэта адзінокія састарэлыя людзі. Калі і надалей прыводзіць статыстычныя лічбы, дык нагадаем, што 23 адзінокія дзядулі і бабулі са Слонімшчыны сёння знаходзяцца ў Новадзевяткавіцкім доме-інтэрнаце для састарэлых.

Днямі карэспандэнты "ГС" наведалі гэтую ўстанову. Здалёк было бачна, як добраўпарадкоўваецца тэрыторыя вакол дома-інтэрната: аднавіўся плот, з'явіліся дзве альтанкі, рамонт паціху ідзе і ўнутры памяшкання. Па словах работнікаў дома састарэлых, найпершая заслуга ў гэтым дырэктара Мікалая Ягаўдзіка.



▪ Марыя Іванаўна Якута чакае свайго сына

Мікалай Іванавіч узначальвае гэты інтэрнат толькі два гады, але яго тут усе паважаюць і любяць. А для гэтых састарэлых людзей ён проста стаў, як сын. Яму нешта раяць, падказваюць, у яго пытаюцца, просяць дапамогі. І Мікалай Ягаўдзік усіх уважліва выслухае, на любую просьбу ён адгукнецца, параіць. Калектыў з ім працуе невялікі, але працы хапае. Жывуць у інтэрнаце і тыя, хто не можа ўжо рухацца, гадамі прыкаваны да ложка — а гэта сем чалавек. Усім трэба дапамагчы, усіх накарміць, пераапрануць, падлячыць.

Падчас гутаркі жыхары інтэрната шчыра казалі, што ім тут добра, што праблем ніякіх у іх не існуе. І сапраўды, для іх паслуг і тэлевізар каляровы, і бібліятэка недалёка ад інтэрната, і магазін побач. І, наогул, жыхары інтэрната — людзі вольныя, яны могуць паехаць да сваіх дзяцей, калі яны ёсць, у сваю родную вёску на месяц-другі і г.д. Праўда, загадзя папярэдзіўшы кіраўніцтва інтэрната.

— Наш інтэрнат разлічаны толькі на 23 чалавекі, больш мы нікога прыняць не можам. Хоць на чарзе патрапіць сюды ўжо аформлена 11 чалавек. Тыя састарэлыя і адзінокія людзі, які знаходзяцца ў нашым доме, атрымліваюць 10 % ад свае пенсіі, астатнія грошы ідуць на іх утрыманне ў інтэрнаце. Жывуць яны па 1-3 чалавекі ў пакоі, іх тры разы на дзень кормяць. Мы таксама адзначаем розныя святы, дні нараджэння, часта перад састарэлымі выступаюць з канцэртамі мясцовыя школьнікі, — сказаў Мікалай Ягаўдзік. А яшчэ Мікалай Іванавіч дадаў, што ёсць у інтэрната і свае праблемы. На сённяшні дзень праблемаю застаецца і запасычанасць за харчаванне.



▪ Мікалай Ягаўдзік, дырэктар дома састарэлых

— Тым не менш, за дзесяць гадоў свайго існавання ніхто ў інтэрнаце ніколі не заставаўся і не будзе без харчавання. Сёлета мы пасадзілі адзін гектар бульбы, сабралі паўтоны рознай агародніны, ды і кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі РУСП "Новадзевяткавічы" заўсёды адгукаецца на нашу просьбу. Дапамагаюць нам і Слонімскае ваеннае лясніцтва, ЖЭС-2, фірма "Тэлкон", РУСП "Шчара" і іншыя арганізацыі і гаспадаркі раёна, — сказаў Мікалай Ягаўдзік.

Па словах Мікалая Іванавіча, адзінокія састарэлыя людзі тут проста жывуць.

— Вось, напрыклад, Марыі Іванаўне Якута ўжо 92 гады, яна родам з Мізгіроў. Сын на некаторы час забраў яе да сябе ў Маскву. Жыла яна ў яго кватэры на шаснаццатым паверсе, ды там ёй было сумна. Цяпер тры гады жыве ў нас, тут ёй весялей і лепш, — дадаў на развітанне нам дырэктар дома-інтэрната.

Калі мы садзіліся ў машыну, з памяшкання інтэрната выйшла і села на лаўку, дзе грэла вераснёўскае сонейка, прыгожая і дагледжаная жанчына. Гэта і была Марыя Іванаўна Якута. Сёння на аўтамабілі з Масквы да яе павінен прыехаць сын. Вось яна і чакае яго, выглядае...

Сяргей ЧЫГРЫН

ЗДАРЭННІ

ЗНЁС З САБОЮ УНІТАЗ

Сантэхнічнае абсталяванне коштам больш як на 100 тысяч беларускіх рублёў знікла з недабудаванага прыватнага дома па вуліцы Рамонкавай у Слоніме.

Па адной з версій работнікаў крымінальнага вышуку, да крадзяжу можа мець дачыненне рабочы гаргаза К.

Украдзеная сантэхніка, аднак, пакуль не знойдзена. Расследаванне працягваецца.

Мікола КАНАНОВІЧ

ДЕГУСТАЦИЯ

НОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ – КАЧЕСТВЕННАЯ ПРОДУКЦИЯ?

Около 16 видов молочной продукции Слонимского завода сухого обезжиренного молока продегустировали покупатели магазина №21, который находится на улице Ершова.

У всех присутствующих на этом мероприятии была возможность высказать свои претензии по поводу выпускаемой заводом продукции представителям завода.

"Сметана, которую выпускает наш завод, очень редкая, поэтому я стараюсь покупать этот продукт волковысского производства", — пожаловалась одна из присутствующих женщин.



▪ Проверяем качество на вкус

Однако начальник лаборатории Раиса Вороник, которая присутствовала на дегустации, заверила, что качество сметаны, да и другой продукции, изменилось в лучшую сторону в результате внедрения новых технологий и оборудования.

"Продукция нашего завода стала более качественной. Мы стараемся угодить придирчивому вкусу покупателей", — сказала Раиса Казимировна.

И тем не менее, пришедший на дегустацию народ не унимался: "И кефир у вас кислый! Прямо глаза на лоб лезут, когда его пьешь! Да и молоко быстро портится!".

Но, несмотря на претензии, люди с удовольствием пробовали сметану, сливки, молоко, кефир, творог, сыр и другие продукты, которые в широком ассортименте были представлены на дегустации.

"Прямо-таки не верится, что это действительно продукция слонимского завода. Видимо, очень свежая, поэтому и вкусная", — говорили присутствующие.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

НАВОШТА СТАРЫМ МАКАВАЯ САЛОМКА?

У 70-гадовай жыхаркі вёскі Міжэвічы работнікі міліцыі знайшлі восем грамаў макавай саломкі.

Хоць гэта зусім не многа, але пад артыкул крымінальнага кодэкса жанчына можа патрапіць.

А вось 60-гадовы жыхар вёскі Саленікі захоўваў дома паўтара кілаграма макавай саломкі.

Для якіх мэт пажылыя людзі трымалі дома наркатычную сыравіну, цяпер высвятляюць работнікі праваахоўных органаў.

З ХАТЫ ЗНІКЛІ ЗАЛАТЫЯ ВЫРАБЫ

З 9 па 11 верасня з хаты жыхаркі вёскі Дзеравянчыцы Р. знікла 12 найменняў залатых вырабаў.

Узбуджана крымінальная справа.

Мікола КАНАНОВІЧ

СОЦИУМ

ПРОСПЕКТ ЗАВИСИМОСТИ

Многие тысячелетия назад наши предки вынуждены были отстаивать свое право на существование, борясь с холодом, голодом, дикими животными и природными катаклизмами.

Сейчас, в начале XXI века, человек снова оказался окруженным опасностями, с той лишь разницей, что они в большинстве своем являются продуктом его собственной деятельности. И главной из них являются наркотики.

В нашей стране проблема наркотиков давно переросла из медицинской в политическую и экономическую. Выгодное географическое положение на пути из Азии в Европу с успехом используется отечественной наркомафией. С востока к нам устремляются гашиш и опий (морфин и героин), с запада – синтетические наркотики и галлюциногены (фенамин, "экстази", ЛСД). Обнищание народа тоже играет не последнюю роль: за кусок хлеба люди готовы оказывать услуги кому угодно, в том числе и наркоторговцам.

Незаконные без цели сбыта изготовление, переработка, приобретение, хранение, перевозка или пересылка наркотических средств – наказывается ограничением свободы на срок до пяти лет или лишением свободы на срок от двух до пяти лет.

(ч. 1 ст. 328 УК РБ)

По данным врача-нарколога Григория Небоженко, на сегодняшний день в нашем районе на учете в психоневрологическом диспансере стоит 38 наркоманов, вернее, 37 (один из них недавно умер). Возраст тех, кто выбирает, в основном, тяжелые наркотики и уже не первый день "сидит на игле" – от двадцати до сорока пяти лет. Токсикоманов – восемнадцать. Все они – молодые люди в возрасте до двадцати лет. Восьмерым не исполнилось и восемнадцати.

И это только официальные данные. Медики говорят, чтобы узнать реальные цифры, надо просто умножить официальные на десять. Только один из десяти наркоманов, "балующихся травкой" или сидящих на более тяжелых наркотиках, попадает в поле зрения медиков и правоохранительных органов. Не лучше дела обстоят и с продавцами опасного "зелья".

Чаще всего за хранение и сбыт наркотических средств к ответственности привлекаются бабушки и дедушки. С наступлением осеннего периода вместе с картошкой и помидорами на их приусадебных участках созревают мак и конопля. "Мой внучок очень уж любит домашние пирожки с маком. Вот я и посадила немного, приедет из города – побалую", – так, или почти так, объясняют старушки участковому милиционеру, как на их огороде оказалось запрещенное растение. Кто-то действительно говорит правду, кто-то лукавит, но одно несомненно: для каких бы целей ни выращивался наркотик, ответственность за это нести придется. Чаще – административную, реже – уголовную.

Посев или выращивание с целью сбыта или изготовления наркотических средств, запрещенных к возделыванию растений – наказываются штрафом, или арестом на срок до шести месяцев, или ограничением свободы на срок до трех лет, или лишением свободы на тот же срок.

(ч. 1 ст. 328 УК РБ)

Наркотики наносят вред не только самому наркоману, но и окружающим его людям – как близким, так и совсем незнакомым. Поскольку добыча наркотиков превращается для него в единственный смысл жизни, то он постоянно пребывает в поисках денег. А денег нужно немало. Например, на героин в сутки может уходить до 50 "зеленых". Как правило, нормальным образом зарабатывать деньги наркоман не может. Сказывается общее отравление организма наркотиками и общее депрессивное состояние, которое преследует наркомана во время вынужденного "перерыва" в употреблении наркотиков. Как раз в то самое время, когда он, теоретически, мог бы зарабатывать деньги. Еще большие проблемы с деньгами у подростков и студентов.

По данным американских исследователей, около 20% всех подростковых преступлений тем или иным образом связано с наркотиками. "Шестнадцатилетний сын ударил топором отца после того, как он отказался дать деньги на покупку наркотиков", "подростки ворвались в дом одинокой пенсионерки, избили ее, требуя отдать все сбережения", "девочка-восьмиклассница украла из дома своей подруги золотые украшения ее матери, чтобы продать их, а вырученные деньги отдать другу-наркоману" – такими подробностями пестрят периодические издания.

В семьях, где родители или дети-подростки употребляют наркотики, конфликты с трагическим концом возникают на 45% чаще, чем в обычных.. В семьях, где наркоманами являются дети (а по разным оценкам около 20-25% подростков употребляют разного рода психотропные вещества), чаще сталкиваются с подростковыми преступлениями, побегами из дома, попытками совершить суицид. Подростки пытаются выяснить свои отношения с "непонимающим" их миром вокруг. И для этого они создают свой новый мир, привлекая в него все больше и больше своих сверстников. Причем, что бы ни говорил наркоман о том, что никого не заставлял и не принуждал, чаще всего привлечение в свою группу новых членов является одним из условий получения наркотиков.

Склонение к потреблению наркотических средств или психотропных веществ – наказывается арестом на срок до шести месяцев, или ограничением свободы на срок до пяти лет, или лишением свободы на тот же срок.

(ч. 1 ст. 328 УК РБ)

Дельцы заинтересованы в увеличении своей клиентуры. Расслабленному человеку кажется, что исчезли все проблемы, что можно погрузиться в мир грез и иллюзий, но продавцам доподлинно известно, что на горизонте появился еще один клиент до последнего вздоха. А по дороге к могиле сумеет втянуть еще несколько человек. Еще в начале века Михаил Булгаков писал: "Я достаточно попробовал. Других предостерегаю: будьте осторожны с белыми, растворимыми в 25 частях воды кристаллами. Я слишком им доверился, и они меня погубили".

И даже если наркоман не умрет от передозировки, на его жизненном пути будет еще достаточно рискованных поворотов. Если еще несколько лет назад основным путем передачи ВИЧ-инфекции считали половой, то сейчас на первое место вышла новая "группа риска" – наркоманы. Больше всего ВИЧ-инфицированных в возрастной группе от 20 до 25 лет, около 85% которых – любители острых ощущений.

Парадоксально, но факт: средства массовой информации ежегодно убедительно показывают неотвратимость роковых последствий наркозависимости, а количество наркоманов растет. За последние десять лет их количество в нашей стране увеличилось почти в 7 раз. И вчерашняя улица давно стала проспектом с односторонним движением, движением в никуда.

Янина МЕЛЬНИКОВА



■ В поисках ложной радости так легко заблудиться

БУКВА ЗАКОНА

СДЕЛКИ С НЕДВИЖИМЫМ ИМУЩЕСТВОМ

(Окончание, начало в № 326)

Для действительности сделок с недвижимостью необходимо, чтобы они отвечали требованиям законодательства, касающихся формы (например, ГК РБ сохранил обязательную нотариальную форму для сделок купли-продажи недвижимости, дарения недвижимости (!)).

Условия действительности сделок с недвижимостью, принадлежащей гражданам, касаются и предмета договора. В договоре в обязательном порядке должны быть указаны данные, которые позволяют установить то недвижимое имущество, которое подлежит передаче (!). Собственники недвижимости или уполномоченные ими лица обязаны предъявить документы на домовладение, садовый дом, дачу, земельный участок, гараж: технический паспорт, справку органа регистрации и технической инвентаризации, государственный акт на земельный участок или иной документ, предусмотренный законодательством.

Действующее законодательство (ст. 131 ГК) требует обязательной регистрации права собственности и других вещных прав на недвижимость, ограничений этих прав, их возникновения, перехода и прекращения!

Какие же необходимы документы для осуществления сделок с недвижимостью? Например, для осуществления договора мены граждане должны иметь:

1) технические паспорта, выкопировку из плана домовладения; 2) государственный акт на земельный участок – при мене жилого дома; 3) заверенное в установленном порядке письменное согласие отсутствующих граждан, за которыми сохраняется право пользования жилым помещением; 4) письменное согласие супруги (супруга), если жилое помещение приобретено ими в браке; выписку из решения общего собрания (собрания уполномоченных) членов организации граждан-застройщиков о приеме в эту организацию гражданина, производящего обмен на жилое помещение в доме этой организации; 5) письменное согласие органа опеки и попечительства при мене жилого помещения, находящегося в пользовании гражданина, над которым установлена опека (попечительство), или жилого помещения, в котором проживают несовершеннолетние члены семьи собственника помещения; 6) справку органа регистрации и технической инвентаризации об отсутствии запрета на отчуждение жилого дома, его части, квартиры или другого жилого помещения; 7) разрешение соответствующего исполнительного и распорядительного органа при междугородном обмене; 8) другие документы, вытекающие из существа договора.

Сергей ГЕРАСИМЧИК,
юрисконсульт «Газеты Слонімскай»

ГРОДНА

СУТЫКНУЛАСЯ ПЯЦЬ АЎТАМАШЫН

Аварыя, пры якой сутыкнулася 5 легкавікоў, прыпыніла ўчора на 2 гадзіны рух транспарту на адной з галоўных аўтамагістралей горада – вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў.

На месца здарэння супрацоўнікі ДАІ прыехалі толькі праз 20 хвілін. Машыны перашкаджалі руху транспарту яшчэ каля 2-х гадзін.

Яшчэ больш за 3 гадзіны легкавікі стаялі каля Палаца хімікаў, цяперашняй Гродзенскай філармоніі, дзе супрацоўнікі ДАІ правяралі дакументы і перапісвалі дадзеныя асоб, якія сталі ахвярамі здарэння.

Андрэй МЯЛЕШКА

ГЕНЕРАЛА НИКИТИНА ПОВЫСИЛИ

Александр Лукашенко подписал ряд указов о назначении должностных лиц высшего командного состава Вооруженных сил Республики Беларусь.

Как сообщает пресс-служба президента, глава государства назначил генерал-майора Александра Никитина на должность начальника Главного штаба – первого заместителя командующего Сухопутными войсками, ранее занимавший пост командующего войсками Северо-западного оперативного командования Вооруженных сил.

В соответствии с указом президента, полковник Валерий Хохлов займет должность командующего войсками Западного оперативного командования Вооруженных сил, оставив должность начальника штаба – первого заместителя командующего войсками Северо-западного оперативного командования. На должность начальника штаба – первого заместителя командующего войсками Северо-западного оперативного командования назначен полковник Иван Чаус.

Андрей СЕРЕДА

ЭКОНОМИКА

ЗАДОЛЖАЛ ЗАРПЛАТУ – ЗАПЛАТИ ИЗ СВОЕГО КАРМАНА

С нанимателей, имеющих задолженность по заработной плате, будет удерживаться сумма в размере 1,5 бюджета прожиточного минимума на каждого работника.



■ Теперь без зарплаты работники не останутся

В целях снижения имеющейся в Беларуси задолженности по выплате заработной платы президент страны Александр Лукашенко 14 сентября издал указ № 406, которым внесены изменения и дополнение в указы от 27 ноября 1995 года №483 и от 29 июня 2000 года №359.

Указом предусматривается, что с нанимателей, имеющих задолженность по заработной плате, банком в бесспорном порядке будет удерживаться сумма платежа, направляемого на погашение этой задолженности, соответствующая 1,5 размеру бюджета прожиточного минимума для трудоспособного населения (на каждого работника), скорректированного на индекс потребительских цен. (Ранее сумма этого платежа исчислялась из размера одного бюджета прожиточного минимума).

Платежи эти будут внеочередными. С учетом отчислений на неотложные нужды (до 10 процентов средств, поступивших на текущий (расчетный) счет организации за предыдущий месяц) это даст организациям, имеющим задолженность по заработной плате, дополнительную возможность погасить ее в кратчайшие сроки.

Как подчеркнули в пресс-службе президента, наличие задолженности по выплате заработной платы является грубейшим нарушением статьи 73 Трудового кодекса Республики Беларусь, в соответствии с которой наниматель обязан выдавать заработную плату работникам в сроки, установленные коллективным договором (соглашением) или трудовым договором.

В целях усиления материальной заинтересованности нанимателей в ликвидации и недопущении в дальнейшем образования задолженности по заработной плате указом изменен порядок применения тарифной ставки. В организациях, имеющих задолженность, с 1 числа месяца, следующего за отчетным, для расчета должностных окладов управленческого аппарата будет применяться тарифная ставка первого разряда в размере, не превышающем величину, устанавливаемую правительством для оплаты труда работников бюджетной сферы.

Данное ограничение действует до ликвидации задолженности по заработной плате. После расчета с работниками наниматели вправе вернуться к применению тарифной ставки, действовавшей на момент появления задолженности.

БЕЛТА

ГРОДНО

ГРАЖДАНАМ РОССИИ ПРЕДЪЯВЛЕНО ОБВИНЕНИЕ В УБИЙСТВЕ

Обвинение в убийстве жительницы города Гродно предъявила областная прокуратура двум гражданам Российской Федерации. 36-летние жители города Иваново свою вину не признают.

По информации УВД Гродненского облисполкома, заявление об исчезновении женщины 1947 года рождения подал в милицию ее муж. Очевидцы утверждают, что утром 1 сентября женщину насильно усадили в автомобиль "Москвич" и увезли в неизвестном направлении двое молодых людей. В области был объявлен план "перехват". В тот же день машина с гражданами России задержана на посту ГАИ около Волковыска. Женщины в автомобиле не было.

О местонахождении жертвы на четвертый день нахождения под стражей сообщил один из задержанных. Тело женщины со следами пыток и многочисленными ножевыми ранениями было найдено 5 сентября в лесу возле деревни Олекшицы Берестовицкого района. Экспертиза установила, что смерть наступила от удушения. Гродненская областная прокуратура по факту убийства возбудила уголовное дело по статье 139 ч.2 УК Беларуси.

Причины убийства выясняет следствие. По неофициальной информации, россияне приехали в Гродно, чтобы вернуть большую сумму денег, одолженную сыном убитой женщины. Сам должник сейчас находится в розыске.

БелаПАН

БЕРЕЗОВКА

ВОЗБУЖДЕНО УГОЛОВНОЕ ДЕЛО

Прокуратура Гродненской области возбудила в отношении председателя Березовского горисполкома Лидского района Александра Сосновского уголовное дело по ч.3 ст.430 "Получение взятки лицом, занимающим служебное положение".

Председатель горисполкома и депутат Лидского райсовета был задержан в ходе получения взятки в размере 1.500 долларов США. Деньги ему передал местный предприниматель за содействие в продаже недвижимости по заниженной стоимости.

По словам следователя прокуратуры Гродненской области Николая Бритько, сейчас Сосновский находится в следственном изоляторе города Гродно. По закону ему угрожает лишение свободы сроком от 7 до 15 лет.

БелаПАН

ЛИДА

МОЛОЧНО-КОНСЕРВНОЕ САМОУБИЙСТВО

До десяти лет лишения свободы грозит бывшему директору Лидского молочно-консервного комбината Владимиру Лысухе по обвинению в неоднократном получении взяток в особо крупных размерах. Еще один подозреваемый по этому делу покончил жизнь самоубийством, другой находится в бегах.

Владимиру Лысухе следствие инкриминирует получение взяток на общую сумму $15,5 тыс. Следствие полагает, что Лысуха получал эти деньги от гродненской частной строительной фирмы «Фиксаж» за оформление заказов на ремонт и реконструкцию административного и некоторых производственных помещений завода.

Кроме того, Лысуха обвиняется в халатности. Следствие полагает, что он без проверки подписывал документы о приеме работ, благодаря чему директор «Фиксажа» Шульга, завысив объемы работ, положил в карман 288 млн. рублей.

Бывший директор комбината также обвиняется в превышении служебных полномочий, что выразилось в покупке без разрешения облисполкома линии по производству казеина на 136 млн. рублей, тогда как следствие располагает экспертной оценкой этой линии в 36 млн. рублей.

Следствие закончено, уголовное дело передано в суд. Еще одним обвиняемым по этому делу мог стать главный инженер предприятия Андрей Маевский, однако он покончил жизнь самоубийством еще до предъявления обвинения.

В апреле, после дачи первых объяснений следствию, Маевский, будучи еще в статусе подозреваемого, выбросился из окна туалета, что на четвертом этаже в здании Гродненского УВД. Однако до этого в объяснениях следствию он успел признать свою вину.

Следствие считает, что главный инженер Маевский также брал взятки от Шульги на общую сумму примерно $15 тыс., но уже за подписание актов выполненных работ. Кроме того, следствие уверено, что Маевский вместе с Шульгой участвовал в хищении тех 288 млн. рублей.

Естественно, обвинение Маевскому так и не было предъявлено «в связи с его смертью», а дело в отношении него прекращено. По версии следствия, директор и главный инженер не были осведомлены о «подпольных» делах друг друга. Скорее всего, посредником между ними выступал Шульга, используя каждого без ведома другого.

Дело о хищении 228 млн. выделено в отдельное производство. Вынесено постановление об аресте директора «Фиксажа» Шульги. Он скрывается и объявлен в розыск, у следствия есть данные, что он находится в России.

Как говорят следователи, самоубийство – исключительный случай в такого рода делах. Расследование гибели Маевского длилось около четырех месяцев. Однако прокуратура Ленинского района Гродно не нашла вины работников УВД. В тот день Маевского вместе с Лысухой вызвали в ОБЭП Гродненского УВД, там им сообщили о возбуждении уголовного дела и взяли объяснения. После этого Маевский вышел в туалет и выбросился из окна. На момент самоубийства он был в статусе подозреваемого, мера пресечения для него обозначена не была, поэтому и за его перемещениями по коридорам УВД никто не наблюдал.

Сейчас Владимир Лысуха находится под арестом в Гродненском СИЗО. По словам адвоката Юрия Дятчика, он не признает ни одно из трех обвинений. В начале следствия на очной ставке с Шульгой он признал получение $4 тыс., но потом от этих слов отказался, заявив, что оговорил себя в стрессовом состоянии. Следствие в доказательстве фактов взяток опирается также в основном на показания сбежавшего Шульги и косвенные доказательства.

Защита намерена оспаривать экспертную оценку оборудования для линии по производству казеина, произведенную по запросу следствия Торгово-промышленной палатой. Кроме того, адвокат утверждает, что Лысуха получил разрешение облисполкома на покупку, правда, устное. Для подтверждения этого защита намерена вызвать в суд чиновников облисполкома.

«Самой хлипкой» адвокат Юрий Дятчик называет позицию своего подзащитного по обвинению в халатности в деле с 288 млн. Однако здесь защита намерена использовать факт самоубийства Маевского в свою пользу как фактическое признание им своей вины.

Белорусская газета

ДЗЯТЛАВА

ЦЫГАНКІ АБАКРАЛІ ПЕНСІЯНЕРКУ

Ахвярай трох цыганак стала пенсіянерка з вёскі Сцяткоўшчына Дзятлаўскага раёна.

Як піша газета "Міліцэйскі веснік", жанчына не паспела і слова вымавіць у адказ дзвюм цыганкам, якія сярод белага дня з'явіліся на парозе яе дома.

У той час, пакуль пенсіянерка слухала нечаканых гасцей, іх трэцяя напарніца праз акно залезла ў хату і "пагаспадарыла" ў шафе. І вельмі хутка такім жа чынам пакінула дом.

Калі зладзейка падала сваім сяброўкам умоўны сігнал, усе трое зніклі так жа нечакана, як і з'явіліся. А разам з імі зніклі і паўмільёна беларускіх рублёў, якія гаспадыня трымала ў шафе.

Мікола КАНАНОВІЧ

МОСТЫ

УБИЙЦЫ ПОЛУЧИЛИ СРОК ВМЕСТО СМЕРТНОЙ КАЗНИ

Слушания дела по самому, наверное, зверскому убийству за последнее время завершились в Мостах на прошлой неделе.

Приговор был вынесен областным судом 10 сентября. По статьям, предъявленным обвиняемым, предусматривалось наказание вплоть до смертной казни.

Трое местных жителей: 38-летний Снетько, 20- летний Матисович и 21-летний Дубатовка — были обвинены в убийстве гражданина Нюнько и в покушении на грабёж. Каждый из них был осужден сроком на 23 года лишения свободы в колонии усиленного и строго режимов.

Отец погибшего предъявил иск всем троим — возмещение материального ущерба в размере 10 млн. рублей.

Приговор может быть обжалован в течение 10 дней с момента вручения копии приговора каждому из обвиняемых.

Ирина ЛОЙКО

СМІ

ЗАПРАШАЕ ШКОЛА МАЛАДОГА ЖУРНАЛІСТА

Слонімская філія Беларускай асацыяцыі журналістаў і моладзевае грамадскае аб'яднанне "Ветразь" праводзяць набор на бясплатныя трохмесячныя курсы моладзі ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў у Школу маладога журналіста.

Падчас заняткаў моладзь азнаёміцца з асновамі журналістыкі і працай на камп'ютэры.

Запрашаюцца хлопчыкі і дзяўчынкі, якія мараць звязаць свой лёс з журналістыкай.

Першае арганізацыйнае пасяджэнне адбудзецца ў рэдакцыі "Газеты Слонімскай" 20 верасня ў 16 гадзін па адрасе: г. Слонім, вул. Камсамольская, 8.

Тэлефон для даведкі: 2-14-39.

МАСТЫ

АЛЕСЮ БЕЛАКОЗУ СПОЎНІЛАСЯ 75 ГАДОЎ

Алесь Белакоз – постаць знакавая. Хоць ён усё жыццё пражыў у вёсцы, яго ведаюць ва ўсёй Беларусі і нават у замежжы. На такіх, як ён, трымалася беларушчына ў савецкія часы і мацуецца беларускі дух у сённяшнія дні.

Не зважаючы на свае 75 гадоў, Алесь Белакоз дагэтуль працуе дырэктарам Гудзевіцкага літаратурна-краязнаўчага музея, які сам стварыў 38 гадоў таму. Алесь Белакоз па-ранейшаму жыве ў вёсцы Гудзевічы ў Мастоўскім раёне, і па-ранейшаму да яго ахвотна едуць людзі. Экскурсіі, якія ён праводзіць, зацягваюцца на гадзіны. Алесь Белакоз не проста краязнаўца, кіраўнік вясковага музея, ён турбуецца за лёс ўсёй Беларусі:

— Мне вельмі баліць тое, што школы, па назвах беларускія, нічога беларускага не маюць. Яны ператвараюцца ў расійскія. Мне баліць тое, што наша прамысловасць не развіваецца. Мы не пабудавалі за апошняе дзесяцігоддзе ніводнага завода. Як жыць?

У сваім музеі Алесь Белакоз прапагандуе тое, што Беларусь мае мноства карысных выкапняў, якія часта зусім не здабываюць альбо прадаюць праз расійскіх пасрэднікаў. Калі іх разумна і дбайна выкарыстоўваць, беларусы зробяцца заможным народам. Аднак сёння падставы для аптымізму невялікія:



■ Алесь Белакоз

— Незалежнасць я перастаў адчуваць. Бо ўсё вядзецца да таго, каб прадаць Беларусь. І я ўпэўнены, што прадаць могуць не толькі Расіі — Польшчы таксама могуць прадаць. Асабліва Гарадзеншчыну. Дадуць у Калінінград якісьці праезд—калі ласка, бярыце! А што,чужога хіба шкада? Хіба шкадаваў Сталін Беласточчыну?

Алесь Белакоз працаваў да пенсіі настаўнікам, музей стварыў пры мясцовай школе. Ён гаворыць, што ў вёсцы з кожнай хаты ахвяравалі ў музей нейкія старыя рэчы—ганчарныя, кавальскія або зробленыя з дрэва.

— У нас экспанатаў даволі многа, асноўнага фонду—13763 адзінкі. І вельмі каштоўныя экспанаты, якіх няма ў іншых музеях. Але з экскурсіямі ў нас дрэнна. Чаму дрэнна? Прыехаў намеснік міністра ўнутраных спраў, хоча паглядзець музей. Ён адразу з парога: "Мы вам хочам дапамагчы". Я кажу: якая дапамога? У нас план — 1 мільён 600 тысяч рублёў, вы білеты вазьміце. Квіткі, аднак, міліцыянеры не набылі. Потым яшчэ некалькі разоў прыязджалі вялікія групы міліцыянераў — квіткі не куплялі. Паабяцалі, праўда, фарбу і шыфер, але яны ў музей не трапілі. А плану як не было, так і няма. Мала таго, пасля гэтага да нас перасталі ездзіць экскурсіі з іншых гарадоў. Як яны зрабілі: каб паехаць у нейкі музей, — напрыклад, мы хочам у Гродна паехаць, — дык трэба, каб машына заехала ў Масты і там дазволілі везці вучняў. Але так паставілі справу, каб не дазваляць. І ўсе экскурсіі спыніліся, як адрэзала. Гэта, я думаю, вось такая "дапамога" міліцыі.

Алесь Белакоз так мяркуе, бо арганізатары экскурсій, якія не адбыліся, тлумачаць, што ДАІ не дала дазволу на перавоз школьнікаў. І гэта працягваецца ўжо некалькі месяцаў. Колькасць экскурсантаў рэзка скарацілася, аднак Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы музей, якім загадвае Алесь Белакоз, па-ранейшаму застаецца месцам, якое імкнуцца наведаць не толькі беларусы, але і замежнікі, што цікавяцца Беларуссю.

Свабода

БАРАНОВИЧИ

В МОСКВЕ ОСВОБОЖДЕНА ПОХИЩЕННАЯ ДЕВУШКА

В Москве освобождена похищенная в Беларуси девушка. Об этом сообщили российские СМИ со ссылкой на Главное управление по борьбе с организованной преступностью (ГУБОП) Службы криминальной милиции МВД России.

"В начале сентября 2003 года в ГУБОП поступила информация из Комитета по борьбе с организованной преступностью и коррупцией МВД Беларуси об исчезновении в апреле этого года жительницы города Барановичи Екатерины К., 1985 года рождения, и ее возможном насильственном удержании в Москве", — говорится в сообщении пресс-службы ГУБОП. В ходе оперативно-розыскных мероприятий была найдена снимаемая квартира на улице Генерала Берзарина, в которой насильственно удерживалась заложница. Похитители принуждали ее заниматься проституцией.

Екатерина К. была освобождена 8 сентября. На момент проверки в квартире находились две гражданки Украины и гражданка России, занимающиеся проституцией. Они привлечены к административной ответственности. В настоящее время решается вопрос о возбуждении уголовного дела по данному факту. Приняты меры по розыску и задержанию похитителей.

Как сообщил БелаПАН начальник пресс-службы МВД Беларуси Виталий Гринкевич, девушке удалось позвонить родителям в Барановичи 8 сентября. В этот же день она была обнаружена и освобождена сотрудниками российской милиции.

По его словам, на квартире, где содержалась похищенная белоруска, были задержаны два сутенера.

Вячеслав БУДКЕВИЧ

ГРОДНО

ВЫЯВЛЕН ПОДПОЛЬНЫЙ СПИРТЗАВОД

Завод по изготовлению фальшивых спиртных напитков был выявлен в квартире трижды судимого безработного жителя Гродно.

В гараже были обнаружены 550 литров спирта, а в его квартире — 1300 акцизных марок, сотни поддельных этикеток для водки отечественных и иностранных сортов, мешок пробок, стеклянные и пластиковые бутылки, лимонные и вишневые ароматизаторы. "Предприниматель" разбавлял спирт водой из-под крана, разливал жидкость в литровые и поллитровые бутылки, на которые затем наклеивал этикетки водок "Столыпин", "Консул", "Морозов", "Граф Орлов", а также "Панский дом" и "Можейковская".

